*А.І. Белая* (Баранавічы)

# "АКТЫВІСТА ДЫРЭКТЫВЫ" Ў ПРОЗЕ 30-х гг. XX ст.

Адлюстраванне калектывізацыі абумовіла з'яўленне ў мастацтве вобраза "актывіста", "чалавека паперы". Гэта абагульнены вобраз партыйнага кіраўніка ў вёсцы, затым у калгасе. У такой якасці ў рускай літаратуры яго выявіў А. Платонаў [2]. Усе пазнейшыя вобразы такога тыпу, лічаць даследчыкі, толькі дадалі да сутнасці платонаўскага "актывіста" некаторыя псіхалагічныя дэталі – галоўнае ж было адкрыта і бязлітасна выкрыта аўтарам "Катлавана". Важна адзначыць, што і беларуская проза 1-й трэці XX ст. не засталася ўбаку ад вышэйакрэсленай праблематыкі. Так, у мастацкім свеце рамана М. Зарэцкага "Вязьмо" (1932) прысутнічаюць два тыпы "актывістаў". Сымон Карызна жыве і дзейнічае ў імя "Ідэі". Але ў крызісны час да яго прыходзіць асэнсаванне таго, што такія, як ён, "ужо лішнія ў гэтай рэвалюцыі, бо гэтая новая рэвалюцыя, гэты новы этап яе" [1, с. 101] пойдзе без іх. У спадзяванні, што будзе зразуметы, Сымон палка выказвае Веры Засуліч выспелае і набалелае: "Можа, мы сваю ролю ўжо адыгралі… арганічна сталі чужымі ў далейшым поступе рэвалюцыі, адсталі, вытхнуліся, страцілі свой дзейны запал?.." [1, с. 102]. Карызну не дае спакою думка, што "ў партыі могуць быць чыноўнікі, якія будуць рабіць тое, што ім загадаюць, хоць душой, нутром і не ўспрымаюць гэтага" [1, с. 102]. Інакш паводзіць сябе ў момант краху "актывіст Дырэктывы" Пацяроб. Ён "…агрызаўся, лаяўся, нахабна вытыкаў кожнаму яго ўласныя грахі, якіх… нейкім дзівам меў на ведаме безліч, і ўпарта напіраў на іх, як на сваё апраўданне, хоць яны не мелі ніякага дачынення да разглядання справы. І кожны свой выпад… пакрываў трыумфальным поглядам ваяўнічага пераможцы" [1, с. 288]. Рысы "страшнага калектывізатара" Пацяроба надзвычай завострааны, хоць на першы погляд у сімволіцы яго прозвішча няма адмоўнага сэнсу. "Каб ісці наперад, трэба церабіць дарогу" [1, с. 264], – кажа Карызна. Але гэта, бадай, пераўтворанае "Лес сякуць – трэскі ляцяць". Як адзначае аўтар, Пацяроб "быў наскрозь чалавек адміністрацыйны" і не любіў малімоніцца", а ўсё яго аблічча нібы гаварыла: "Ну што ты, братачка, за чалавек? Попел ты, а не чалавек. Шкада мне цябе… а то б узяў ды расцёр цябе нагой, як чорнага жука" (у гэтай сентэнцыі ўгадваецца стаўшае сумнавядомым "стереть в лагерную пыль"…). Пацяроб з пачаткам калектывізацыі "…начапіў на сябе наган", палічыўшы, "што вярнуўся дзевятнаццаты год" [1, с. 66] і вырашыў: "Сама цяпер і разгарнуцца, каб аж затрашчала ўсё навакол" [1, с. 66]. Скончыўшы раскулачванне "ўсіх прызначаных да гэтае мэты сівецкіх гаспадароў", Пацяроб далажыў Карызну: "Раскудлычыў, Сымонка… Цяпер будзем



Репозиторий БарГУ

у калгас запісваць". Ён не сумняваецца: усё пойдзе па плану, бо "план… гэта сацыялізм," і пераконвае Карызну: "Абцярэбім усё на першы нумар" [1, с. 248]. І сапраўды, справа ў яго пайшла досыць гладка, а "што ён рабіў, зайшоўшы ў каторую хату, якія ўжываў метады агітацыі і прапаганды, гэта аставалася на яго шчырым пацяробаўскім сумленні" [1, с. 232].

У мастацкай форме М. Зарэцкі праводзіць думку, што выразная мяжа паміж "актывістамі Ідэі" і "актывістамі Дырэктывы" на пэўным этапе можа знікнуць. Так, на сходзе Карызна бачыў, што "Пацяроб лішне загнуў… але разам з тым ён мімаволі спачуваў яму, працінаўся тымі самымі пачуццямі, у якіх кідаўся Пацяроб…" [1, с. 96]. Больш таго, ён "разышоўся яшчэ горш за самаго Пацяроба" [1, с. 97]. Трагічны парадокс: дбаючы пра светлае будучае нейкага абстрактнага народа, "актывісты" не могуць стрымаць пачуццяў дэструктыўнай прыроды да яго канкрэтных прадстаўнікоў…

Сацыяльная і маральная ізаляцыя, а затым ліквідацыя "актывістаў" ператварае "новае" грамадства ў "аднаасобную гаспадарку", у якой улада належыць "галоўнаму чалавеку". Гэтая думка паслядоўна праводзіцца А. Платонавым, але не застаецца па-за праблематыкай рамана "Вязьмо". "Велічна-непарушны ў сваіх перакананнях"; "каменная ўпэўненасць", "трыумфальны погляд ваяўнічага пераможцы" – гэтыя і іншыя эпітэты арганічна дапасуюцца да аблічча "правадыра ўсіх часоў і народаў". І хоць М. Зарэцкі выкарыстоўвае іх адносна постаці несуразмерна больш дробнага маштабу – старшыні Сівецкага сельсавета Пацяроба, – усё ж будзе дапушчальным меркаванне, што аўтар рамана "Вязьмо" праз канцэпцыю вобраза "страшнага калектывізатара" сівецкага маштабу хацеў зразумець сутнасць характару "галоўнага чалавека" ў савецкай дзяржаве і яго ролю ў вырашэнні лёсу краіны ўвогуле і сялянства ў прыватнасці, выявіць свае адносіны да памылковых рашэнняў у ажыццяўленні калектывізацыі. Як бачым, і ў А. Платонава, і ў М. Зарэцкага тэмы "новага чалавека" і "галоўнага чалавека" набываюць адметныя пункты судакранання. Пазначым асобныя з іх. Так, у дыялогу Якуба Лакоты і Галілея пра гордзіеў вузел фігура Пацяроба ўзбуйняецца да маштабу гістарычных і міфалагічных постацяў, што, на першы погляд, нелагічна. Прычым М. Гарэцкі не імкнецца захаваць гістарычную дакладнасць у маўленні Галілея, важна выказаць праз яго свае адносіны да спосабу вырашэння лёсавызначальных дзяржаўных праблем: "Дурны быў цар… ага… сячы кожны патрапіць… І *гэты* (курсіў наш. – *А.Б.*) сячэ… А хай развяжа, ага… хай развяжа!" [1, с. 243]. Аўтар у гэтым эпізодзе, безумоўна, засцерагаецца, калі піша: "Якуб зразумеў, што стары гаворыць пра Пацяроба", але тут жа працягвае вылучаную вышэй ідэйна-мастацкую лінію. Галілей аніяк не хоча пагадзіцца з тым, што "сячы" азначае дзейнічаць рашуча і смела: "Няпраўда! Няпраўда! Не рашучы ён… Не смелы ён… Ён – рызыкант!.. Ён бурыць… ага… ён разбурае… усё разбурае…" [1, с. 243].



Рэпазіторый БарДУ

М. Зарэцкага надзвычай хвалявалі ўзнятыя пытанні, аб чым сведчыць у першую чаргу сам факт яго звароту да сучасных яму падзей калектывізацыі. Але нават калі пісьменнік ведаў адказы, ён не мог выкласці іх для чытача, не скарыстаўшыся іншасказаннем. Таму, як "совопросник века сего", завастрыў увагу на асабліва балючым з дапамогай менавіта тых мастацкіх сродкаў, якія дазвалялі гэта зрабіць.

**Літаратура**

1. **Зарэцкі, М.** Збор твораў: у 4 т. / М. Зарэцкі. – Т. 3: Вязьмо: Раман; Сымон Карызна: Драм. аповесць. – Мінск: Маст. літ., 1991.
2. Умирающая деревня – символ гибели русского крестьянства в повести А. Платонова "Котлован". – Режим доступа / http: // bank/orenipk/ ru / text / 48_5. htm

*А.М. Бублікава* (Магілёў)

## СПЕЦЫФІКА АДЛЮСТРАВАННЯ ЖАНОЧЫХ ХАРАКТАРАЎ У ПАДЗЕЙНА-РАЗГОРНУТЫХ АПАВЯДАННЯХ 20 – 30-х гг. ХХ ст.

Вобраз жанчыны-ахвяры сацыяльных і сямейна-побытавых абставін невыпадкова быў характэрным для падзейна-разгорнутых апавяданняў 20-х гг. ХХ ст. Тагачаснай грамадскай свядомасцю жанчына ўспрымалася як асоба, якая знаходзілася ў поўнай залежнасці ад волі мужа, улад, грамадска-палітычнага становішча. Калі жанчына паходзіла з незаможнай сям'і, грамадства адводзіла ёй месца на ніжэйшай прыступцы сацыяльнай іерархіі. Самі жанчыны часта згаджаліся з незайздроснай другараднай роляй у сям'і і сферы грамадскіх адносін, а нялёгкі лёс успрымалі як нешта непазбежнае.

Так, напрыклад, вобраз Аўдоцці з падзейна-разгорнутага апавядання З. Бядулі "Бондар" ствараецца паводле прынцыпу часткі ад цэлага: яна была ценем свайго мужа. Таму заканамерна, што, калі памірае муж Даніла, хутка памірае і жонка. Падобны сэнс утрымлівае і падзейна-разгорнутае апавяданне Я. Нёманскага "Маці". Смерць старой Тацціяны паказана не як раптоўная падзея – аўтар паступова вядзе да трагічнага фіналу твора, усё апавяданне прасякнута прадчуваннем непазбежнага апакаліпсісу ў межах маленькага свету, дзе існавала гераіня.

У шэрагу падзейна-разгорнутых апавяданняў 20-х гг. аўтары даюць намёк на тое, што лёс жанчыны не прадвызначаны грамадскай традыцыяй і за лепшую долю неабходна і варта змагацца ("Загубленае жыццё" П. Галавача, "Радасць жанчыны", "Вераснёвыя ночы" К. Чорнага, "Ліпы", "У суп-



Рэпазіторый БарДУ